*1. Адорно Т.* Введение в социологию музыки. — М., 1973. — Вып.2. — С. 108.

*2. Выготский Л.С.* Психология искусства. — М., 1965. — С. 326—327.

*3. Еремеев А.Ф.* Границы искусства. — М., 1987. — С. 163.

*4. Кутырев В.А.* Осторожно, творчество! // Вопр. философии. —1994. —№ 7-8. — С. 74—75.

*5. Моль А., Фукс В., Касслер М.* Искусство и ЭВМ. — М., 1975. — С. 265 —273.

*6. Пантурин В.А.* Внутренний мир личности и искусство. — Свердловск, 1990. — 211 с.

*7. Психология масс:* Хрестоматия. — Самара, 1998. — 592 с.

**Ю.Г. Болатава,**
***выкладчык***

## КНІГА БЕЛАРУСІ — 2000

У канцы XX ст. сцвердзілася ўяўленне аб кнізе як з'яве сінтэтычнай, неаднароднай.

Кнігазнаўствам, культуралогіяй, сацыялогіяй у рознай меры даследаваны тыя ці іншыя аспекты сістэмы кнігі, аднак яе філасофска-культуралагічнае вывучэнне яшчэ чакае даследчыкаў. Мы не прэтэндуем на канчатковы і ўсебаковы аналіз сучаснай кнігі. Але ў гэтым артыкуле паспрабуем прааналізаваць самыя відавочныя, на наш погляд, тэндэнцыі кніжнай культуры Беларусі на парозе XXI ст. Лічым, што гэта будзе цікава і карысна.

Да нашага часу ў чалавецтва склалася ўяўленне аб кнізе як бясспрэчнай культурнай каштоўнасці. Менавіта ў "кнізе кніг" Бібліі і ў іншых свяшчэнных кнігах распавядаецца аб стварэнні свету і яго ўпарадкаванні, замацаваны асноўныя запаведзі і жыццёвыя нормы. Кніга была свяшчэнным дарам і ў той жа час дзейсным зводам усяго назапашанага людзьмі вопыту. Гэта наша спадчына, нашы традыцыі. Дзякуючы кнізе ажыццяўляліся зносіны паміж пакаленнямі і народамі. Кніга, перадаючыся з пакалення ў пакаленне, распаўсюджваючыся ўсё ў новых і новых землях, удасканальвалася, сеяла зерне ведаў і дабра. Гэтыя яе якасці, разам з рэдкасцю і недаступнасцю, надалі кнізе статус феномена, які захаваўся да нашых дзён.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не толькі кніга залежыць ад жыцця, як мы прызвычаіліся думаць, але і жыццё ад кнігі. Шляхам чытання мы трапляем у спецыфічную кніжную прастору, у якой сутыкаюцца грамадскія інтарэсы, культурныя цячэнні і стылі, разгортваюцца гістарычныя падзеі. Без кнігі пад пытаннем аказалася б далейшае існаванне рэлігіі, навукі, адукацыі або права, што дзейнічаюць на падставе кніжных тэкстаў. З кніг “вырастаюць” асноўныя мастацкія і літаратурныя сюжэты.

У глыбокай павазе да яе адчуваецца падзяка кнізе за дапамогу чалавеку ў нейкай жыццёвай сітуацыі, за гістарычныя ўрокі, навуковы абмен думкамі, вялікія адкрыцці, якія ўдасканалілі наша жыццё і сталі вядомымі. Кніга ўспрымаецца намі як светач ведаў, крыніца асветы і адукацыі, звестак аб навакольным асяроддзі. Менавіта з кнігі, з буквара, пачынаецца далучэнне маленькага чалавека да ведаў. Яна міжвольна падштурхоўвае да асэнсавання і аналізу прачытанага матэрыялу, развівае лагічнае мысленне.

Для нашага часу характэрны зварот да мінулага, мы спадзяёмся адшукаць у ім рэцэпты на будучыню. Многія даследчыкі сёння сцвярджаюць, што будучыня кнігі ў XXI ст. — за рунічнай кнігай, г. зн. такой, “дзе толькі заносяцца знакі, якія паказваюць шляхі”. Рунічную кнігу, а ёй былі і гліняныя таблічкі Хамурапі, скрыжалі Маісея і скандынаўскія руны Одзіна, можна чытаць з любога месца ў залежнасці ад уласнага светаўспрымання і ад шляху, які абраў чытач. Дастаткова таго, як прапаноўвалі ў сярэднявеччы, вобразна кажучы, каб заўсёды трымаць кнігу адкрытай. Прыхільнікамі “новай архаікі” кнігі можна завочна лічыць многіх пісьменнікаў, напрыклад рускіх постмадэрністаў або Х.Картасара, яго “Гульню ў класы”, дзе аўтар прапануе два варыянты чытання: традыцыйнае па парадку і ўразбіўку па схеме. Вынікі атрымліваюцца розныя: у першым выпадку перад намі — жыццёвыя калізіі маладога чалавека, у другім — трагедыя лацінаамерыканскай інтэлігенцыі. Спрабуючы чытаць з гэтых пазіцый беларускую літаратуру, мы разумеем, што і тут нямала перспектыў для рунічнай кнігі. Напрыклад, зборнік лірыкі Л.Дранько-Майсюка “Стомленасць Парыжам” можна чытаць паслядоўна, верш за вершам, так, як яны змешчаны ў зборніку. Тады мы даведаемся аб гісторыі кахання Паэта і Цудоўнай А. крок за крокам. А можна пачаць з выпадкова адкрытай старонкі, у залежнасці ад уласнага настрою выбіраючы сумныя або жартоўныя вершы і нанізваючы іх на асабістыя ўспаміны і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асацыяцыі. І тут прыходзіць сваё разуменне паэзіі Л.Дранько-Майсюка, пашыраецца і ўзбагачаецца ўнутраны свет чытача. Нават Інтэрнет і файлы камп'ютэра можна лічыць электроннай рунічнай кнігай.

XX ст. для большасці краін свету гэтак жа, як і для Беларусі, адзначана "рэвалюцыяй у свеце кніг" (1). Сапраўды рэвалюцыйны размах набылі перамены, што адбыліся ў кніжнай культуры: змяніліся самі кнігі, іх вытворчасць, распаўсюджванне, чытачы. Гэтую рэвалюцыю немагчыма разглядаць без узаемасувязі з іншымі сацыяльнымі працэсамі, такімі як дэмакратызацыя, адукацыйны выбух, паляпшэнне ўмоў жыцця, навукова-тэхнічны прагрэс. Прагрэс у выданні і распаўсюджванні кніг зрабіў звычайнымі вялікія тыражы, спрыяў росту цікавасці чытачоў. Кніга прыйшла ў кожны дом, стала нашай пастаяннай спадарожніцай у вучобе і працы, у час адпачынку.

Сацыяльна-эканамічны крызіс апошніх дзесяцігоддзяў, натуральна, закрануў сферу кнігавыдавецкай дзейнасці. Дзяржаўныя выдавецтвы адчулі на сабе гэта ў поўнай меры. Яны працягваюць існаваць дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы і дзяржзаказу. На 100% фінансуецца выданне беларускамоўнай і на 50% — рускамоўнай літаратуры. Большасць выданняў уяўляюць сабой кнігі беларускіх аўтараў, якія пішуцца на беларускай і рускай мовах. Гэта мастацкая літаратура, кнігі па гісторыі і культуры, падручнікі і інш. Некаторыя выходзяць са становішча, выдаючы гэтак званую камерцыйную літаратуру, дзеля таго каб рэалізаваць іншыя свае паліграфічныя задумы. Сярод дзяржаўных выдавецтваў ёсць такія, якія знаходзяцца ў цяжкім становішчы ("Мастацкая літаратура"), і адносна паспяховыя ("Беларусь", "Юнацтва"). Апошнія абавязаны сваім поспехам перагляду выдавецкай і маркетынгавай стратэгій, у іх створаны і актыўна дзейнічаюць аддзелы маркетынгу і рэкламы. Аднак нават яны ў апошнія гады скарацілі выпуск літаратуры амаль удвая.

Тым не менш, аналізуючы паказчыкі кнігавыдання ў рэспубліцы з 1978 г., бачым няўхільны рост выпуску кніжнай прадукцыі. Так, у 1978 г. выйшла ў свет 1347 назваў кніг і брашур, у 1988 г. — 1450, у 1993 г. — 2926, а ў 1996 г. — 3809 назваў. Пастаянна павялічваўся выпуск літаратуры на беларускай мове, затое значна зменшыўся сярэдні тыраж кнігі ў параўнанні з застойнымі гадамі. Зразумела, што тады вялікі тыраж рэдка сведчыў аб вялікім попыце на кнігу, выходзіла шмат палітызаванай макулатуры. Але ці ж добра, калі сёння ў дзяржаўным выдавецтве кніга

выходзіць тыражом 6—10 тыс. экз. і то зрэдку? А раней звычайным быў выхад 150—200 тыс. экз. Атрымліваецца, што значныя тыражы беларускім выдаўцам дапамагаюць атрымаць камерцыйныя выдавецтвы.

Сёння з упэўненасцю можна сцвярджаць: кніга ў поўнай меры стала архетыпам. Кніга ніколі не рэалізавалася як феномен зямной цывілізацыі сама па сабе, без пастаяннай узаемасувязі з эпохай, грамадствам, чалавекам. У якасці прыкладу звернемся да чарговых трансфармацый кнігі, якія адбыліся ў канцы XX ст. Канец 80—пачатак 90-х гг. стаў часам глыбокіх сацыяльных узрушэнняў і змен. Палітыка галоснасці і "адчыненых дзвярэй", якая прыйшла на месца партыйнай цэнзуры і "жалезнай заслоны", аказала найбольшы ўплыў на развіццё ўсіх без выключэння сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку і кнігі. У постсавецкім грамадстве сталі гаварыць пра ўваходжанне ў сусветную інфармацыйную і культурную прастору, прыкладаць рэальныя намаганні ў гэтым накірунку. Цяпер мы бачым вынікі: дзейнічаюць спадарожнікавае тэлебачанне, глабальныя інфармацыйныя сеткі, культурна-інфармацыйныя цэнтры. Айчынную кнігу, лепшыя яе ўзоры вылучаюць высокі мастацкі ўзровень, самабытнасць, прафесіяналізм падыходу як да адзінага цэлага, адпаведнасць формы і зместу.

Айчыннае кнігавыданне да апошняй пары было справай выключна дзяржаўнай. Зараз жа з'явіліся недзяржаўныя (прыватныя, камерцыйныя) выдавецтвы, якія выпускаюць усё больш літаратуры. З пачатку 90-х гг. колькасць недзяржаўных выдавецтваў пастаянна расце, і цяпер яна значна перавышае колькасць дзяржаўных. Іх прадукцыю можна знайсці ў кожным кніжным магазіне. Мы можам спрачацца аб іх літаратурным узроўні і мастацкім афармленні, але факт застаецца фактам: сёння іх доля ў кнігавыданні стала значнай. Прыватныя выдавецтвы — несумненная з'ява ў сучаснай кніжнай культуры Беларусі. Яны — пастаянныя ўдзельнікі і лаўрэаты выставы "Беларуская кніга". Свой след у айчынным кнігавыданні пакінулі выдавецтвы "Паліфакт", "Адраджэнне", "Тэхналогія", "Экаперспектыва". Плённа працуюць таксама "Асар", "Сучасны літаратар" і інш.

Іх дзейнасць мае пэўнае дачыненне да сённяшняй маскультуры. Акупнасць кніжнай прадукцыі з'яўляецца для іх адным з галоўных прынцыпаў. Яны ўмела ўздзейнічаюць на псіхалогію радавога спажыўца, выпускаючы вялікімі тыражамі кнігі ў яркіх, прыцягальных вокладках, на ндрэннай паперы і якаснага друку. Прыватныя беларускія выдавецтвы мяняюць стратэгію ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпаведнасці з чытацкімі запытамі. Раней чыталі фантастыку і Дж.Х.Чэйза, дамскія раманы, потым нас захліснула хваля айчынных дэтэктываў, а зараз чытачы ўсё больш цікавяцца энцыклапедычнай, камп'ютэрнай літаратурай, разнастайнымі пазнавальнымі выданнямі. Гэтыя выдавецтвы гнутка аперыруюць цэнамі ў адпаведнасці з чытацкім ажыятажам, тыражом, узроўнем выканання і нават жанрам. Напрыклад, новая кніга А.Марыніна у папяровым пераплёце наўрад ці будзе каштаваць больш за 250 беларускіх рублёў. Яна ж, але ўжо ў кардонным пераплёце, каштуе 450 руб. А што-небудзь накшталт "Гасціных" або "Вашага сабакі", напэўна, пацягне за тысячу. Нумар "Cosmopolitan" таксама абыдзецца не танна.

Адкуль у нас гэтае імкненне да маляўнічых выданняў еўрапейскага ўзроўню? Здаецца, справа тут у агульнай змене нашых адносін да катэгорыі формы. Раней лічылася, што рускага (савецкага) чалавека вылучае перш за ўсё багаты духоўны свет. Чужаземцы гаварылі аб загадкавай рускай душы і прыгадвалі Ф.М.Дастаеўскага і А.П.Чэхава. "Маральны кодэкс будаўнікоў камунізму" патрабаваў ад нашых суграмадзян стаць усебакова развітой асобай. Але магчымасцей ўбачыць прыгожае жыццё, а тым больш увасобіць яго ў сваёй сям'і, кватэры, адзенні ў большасці не было. Мы да канца жыцця павінны былі стаяць ў чарзе і насіць нямодныя сукенкі. І вось у пачатку 90-х гадоў у гарадах з'яўляюцца валютныя аддзелы магазінаў і рэчавыя базары. Прадпрыемствы змянілі назвы і пераарыентаваліся на выпуск сучаснай прадукцыі. Адкрыліся першыя прыватныя магазіны і супермаркеты. Можна спрачацца аб іх даступнасці і асартыменце, але факт застаецца фактам: штодзённае жыццё гараджаніна стала больш сучасным і эстэтычным. Кожны прыходзіць у магазін, дзе бачыць еўрапейскі дызайн, прыветных, усмешлівых прадаўшчыц, дзе гучыць музыка і можна адпачыць у кафэ. Офісы фірмаў абсталяваны разнастайнай карыснай тэхнікай, яны сталі ўтульнымі. У кватэрах робяць еўрарамонт, ездзяць на дарагіх машынах. У нашу мову трывала ўвайшлі словы "стыль", "інтэр'ер", "конкурс прыгажосці", "мадэль", "куцюр'е" і інш.

Усё гэта, вядома, аказала ўплыў на якасць жыцця і адбілася на нашых патрабаваннях у адносінах да кнігі. Якой яна павінна быць сёння? Перш за ўсё, на наш погляд, візуальна прыцягальнай, выклікаць прыемныя асацыяцыі, быць не абавязкова даўгавечнай і моцнай, але цікавай, адпавядаць нашым сённяшнім патрабаванням. Яна можа быць сур'ёзнай, але і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(часцей) забаўляльнай. Ашаламляльны кантраст з нашым нядаўнім уяўленнем аб кнізе.

Кожны жанр (нават сублітаратура) мае права на існаванне хаця б таму, што любая кніга сімвалізуе пэўны ўзровень адукаванасці, багацця, развіцця мыслення і тыпу правядзення вольнага часу і адпавядае запытам розных сацыяльных груп. Яна заўсёды мае на ўвазе наяўнасць верагоднага чытача, веданне шляху, па якім ён хоча ісці. Сёння нават прапаганда кнігі ў бібліятэках зазнала сур'ёзныя змены: усё большая ўвага надаецца гульнявым мерапрыемствам з займальнымі элементамі, найбольш цікавымі для чытачоў.

У значнай меры гэта вынік прыходу "paperbacks" ("кніг у папяровай вокладцы"), даўно вядомых свету. Іх гісторыя пачалася ў 1935 г., калі сэр А.Лейн заснаваў у Лондане выдавецтва "Пінгвін" і выпусціў масавым тыражом першыя недарагія невялікага фармату і даволі якасныя кніжкі. З той пары прайшло няма́ла часу, і paperbacks заваявалі ўвесь свет (2). Але, як у Францыі і Германіі, дзе ў свой час таксама праводзіліся падобныя эксперыменты і дзе ўсё ж сапраўдны бум пачаўся толькі з наступленнем спрыяльных умоў, у нас "кнігі ў папяровай вокладцы" з'явіліся толькі ў канцы XX ст. У большай ступені дадзеная з'ява датычыць прадукцыі недзяржаўных кніжных выдавецтваў.

Дзякуючы гэтаму глабальнаму нашэсцю так званая "ніжэйшая літаратура" аказалася нароўні з "сапраўднай літаратурай". Ніжэйшая, або, іншымі словамі, інфалітаратура доўгі час была пабочнай дачкой літаратуры адукаваных людзей. Яна, пераважна ў выглядзе paperbacks, у другой палове XX ст. адваёўвала сваё права на існаванне. Менавіта яна востра паставіла праблему паралітаратурнага, г.зн. таго, што знаходзіцца па-за межамі сапраўды літаратурнага. Справа ў тым, што, дзякуючы масавым тыражам, кнігі, якія нарадзіліся і атрымалі прызнанне спачатку ўнутры абмежаванай сацыяльнай групы, нечападзявана ўступілі ў кантакт з новым непрадбачаным чытачом і заваявалі яго.

Сёння вылучаюць звычайную утылітарную кнігу і кнігу як прадмет мастацтва, якая ўяўляе сабой сінтэз твора, напісанага аўтарам, задум мастака і патэнцый выдаўца. Магчыма, што ў адносінах да такіх кніг мы з цягам часу наблізімся да сярэдневяковых адносін да кнігі, калі за яе аддавалі памесце, а "старонка, упрыгожаная залатымі літарамі, успрымалася як адзнака Божая". Сапраўды, у адносінах да шэрага кніг сёння

фарміруецца паняцце як аб асаблівых прадметах, творах мастацтва. Пра іх па-ранейшаму можна гаварыць, што яны ўспрымаюцца людзьмі як несумненная, непадуладная часу культурная каштоўнасць.

Да негатыўных момантаў трэба аднесці тое, што paperbacks садзейнічалі таму, што кніга стала ўспрымацца не толькі і не столькі як твор, а ў большай ступені як рэч. З аднаго боку, гэта дрэнна: кніга пастаўлена ў адзін шэраг з празаічнымі прадметамі нашага ужытку. З другога боку, мы сталі звяртаць увагу на яе мастацкае афармленне як на самастойную каштоўнасць. Адраджаецца творчая цікавасць да нестандартных кніг (малафарматных, фаліянтаў), да мастацкіх альбомаў, падарункавых і багата ілюстраваных (у тым ліку дзіцячых) выданняў. Фарміруюцца адносіны да кнігі як да чыста дэкаратыўнай каштоўнасці, да твора мастацтва. Выходзіць з друку шмат коміксаў, красвордаў, альбомаў для наклеек, паштовак. Працягваецца распрацоўка інжынерна-дызайнерскіх праектаў у галіне беларускай кнігі. Такім чынам, у наяўнасці візуалізацыя культуры, і ў прыватнасці кнігі. Для сучасных кніжнікаў мастацкае афармленне мае велізарнае значэнне. Ідэальная кніга, кажуць яны, павінна мець сваё непаўторнае аблічча, таму што яна каштоўнасць. Яна павінна ствараць у пакупніка або чытача ўяўленне аб культурнай прасторы кнігі і асяроддзя, у якім жыў аўтар, "дыхаць" сваім асаблівым паветрам. Значным тут становіцца ўсё: ілюстрацыі і іншыя элементы афармлення, размяшчэнне тэксту, шрыфт, знакі выдавецтва і серый, нават свабодныя палосы ўздоўж старонкі тэксту і прабелы. Асабліва слынная школа беларускай кніжнай графікі. Так, кнігі афармлялі М.Селяшчук, У.Савіч, В.Славук, А.Лось, Т.Беразенская. Айчынныя выданні адзначаны шматлікімі ўзнагародамі рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных конкурсаў мастацтва кнігі. Камерцыйныя выданні далёка не заўсёды адпавядаюць высокім узорам кніжнага мастацтва, у большасці недзяржаўных выдавецтваў працуюць звычайныя мастакі, а не прафесіяналы. Тым не менш і сярод іх можна назваць выданні сусветнага ўзроўню (серыя "Вынікі стагоддзя. Погляд з Расіі" выдавецтва "Паліфакт", выданні "Белфакса" і інш.).

У апошняе дзесяцігоддзе ў Беларусі не згасае цікавасць да нетрадыцыйнай кнігі. Раней перспектывы кнігі звязваліся ў асноўным з мікраформамі (мікрафільмамі, мікрафішамі). Потым позіркі скіраваліся ў бок электроннай кнігі. У бібліятэках і розных

інфармацыйных цэнтрах актыўна ствараліся базы і банкі даных, пазней, з развіццём і распаўсюджваннем камп'ютэрнай тэхнікі, — і паўнатэкставыя дакументы. У аўтаматызаваным рэжыме вядзецца ўлік паступлення, выбыцця і выдачы аўдыё- і відэаматэрыялаў, а з 1996 г. — CD-ROMаў. Сур'ёзныя змены адбыліся ў быце: прагрэс аўдыё- і відэатэхнікі зрабіў звыклым наяўнасць у кватэры відэамагнітафона, CD-плэера, персанальнага камп'ютэра. Свет ведаў звычайнага чалавека істотна пашырыўся. Інфармацыя, якая выкарыстоўваецца ў вучобе, працы і ў вольны час, стала захоўвацца не ў традыцыйным друкаваным, а ў іншым выглядзе. Асабліва значныя змены адбыліся з доступам беларусаў у Інтэрнет. Узніклі віртуальны свет і якасна іншыя віртуальныя зносіны. З'явілася паняцце віртуальнай кнігі. Яна зрабіла рэальнай мару многіх філосафаў і бібліятэкараў — сабраць усе кнігі ў адным месцы. Правобразамі віртуальнай бібліятэкі можна лічыць знакамітую Александрыйскую, што пакінула прыметны след у чалавечай культуры, а таксама бібліятэкі, якія стварылі ў сваіх творах Х.Л.Борхес і У.Эка. Актыўна развіваецца замежная і руская электронная літаратура. Камп'ютэр навучыўся ствараць вершы і пісаць музыку. За кнігай больш не трэба нікуды хадзіць, зніклі геаграфічныя і храналагічныя бар'еры ў атрыманні інфармацыі. Многімі серверамі сетак можна карыстацца бясплатна. Разам з тым віртуальная рэальнасць спарадзіла безадказнасць, непрафесіяналізм і адкрытыя спекуляцыі фактамі і відэаматэрыяламі ў Інтэрнеце. Пахіснуўся давер да "свяшчэннай каровы" сучаснасці — інфармацыі. У гэтых умовах кніга застаецца надзейнай крыніцай праверaных звестак, сродкам далучэння да культурнай і літаратурнай спадчыны, да традыцый.

У XX ст. працэс інфарматызацыі надаў інфармацыі нябачаны раней суперстатус. Яна стала адной з найважнейшых каштоўнасцей сучаснага чалавека, прычым як у грамадскім, так і ў асабістым планах. Сама інфармацыя, яе фізічныя ўласцівасці: хуткасць, з якой яна дастаўлена, яе аб'ём — сёння вызначаюць грамадскія і персанальныя прыярытэты тых ці іншых папулярных тэлеканалаў, або радыёстанцый. Інфармацыя застаецца тым, за што аддаюць вялікія грошы. Яна здольная аказваць уплыў на палітычныя, ваенныя і культурныя падзеі. Выпадкова атрыманая інфармацыя можа падштурхнуць чалавека да пэўнага ўчынку, абумовіць яго выбар і тым самым крута змяніць звычайнае цячэнне жыцця і ў канчатковым выніку лёс.

У апошнія два дзесяцігоддзі ў нашай рэспубліцы адбываецца пераарыентацыя на новыя, сучасныя носьбіты інфармацыі. Рэальна пачаўся працэс інфарматызацыі, пабудовы інфармацыйнага грамадства. Яго, на наш погляд, трэба было б звязаць з перабудовай у былым СССР, навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй і пранікненнем новых тэхналогій у наш быт, з першымі крокамі камп'ютэрызацыі. За гэты час адбылося паказальнае змяшчэнне акцэнтаў: уласцівы нашаму светапогляду стыентысцкі, тэхнакратычны погляд на свет, памножаны на доўга стрымліваемае імкненне да ўсяго перадавога і сучаснага, што ёсць у свеце, і да самога гэтага свету, як аказалася, агромністаму і нам невядомаму, — усё гэта спарадзіла "выбух камунікацый". Гэта выбух зносін наогул і выбух захаплення разнастайнымі тэхнічнымі сродкамі камунікацыі — ад першых відэамагнітафонаў да апошняй мадэлі камп'ютэраў.

У адносінах да кнігі сёння таксама, безумоўна, спрацоўвае ўстаноўка на атрыманне інфармацыі. Многімі вучонымі-кнігаведамі інфармацыйная функцыя кнігі прызнаецца важнейшай. Галоўнае, што сёння спажывец патрабуе ад кнігі, — гэта паўната задавальнення патрэбы ў нейкай інфармацыі (нават у адносінах да мастацкай літаратуры). У ёй чытач шукае адказаў на пытанні, што задае яму жыццё, спрабуе адрозніць мастацкі вымысел ад рэальных, часта вядомых усім падзей. На даведачныя, энцыклапедычныя выданні, спецыяльную літаратуру, літаратуру па дызайне памяшканняў заўсёды вялікі попыт. Гэтыя патрабаванні змянілі сітуацыю на кніжным рынку: зараз навукова-пазнавальных выданняў прадстаўлена больш, чым калісьці. Разам з тым тэматыка выданняў значна звузілася, бо дзяржаўныя выдавецтвы, навучальныя ўстановы і навукова-даследчыя інстытуты, якія выдавалі раней кнігі ў вялікім асартыменце, цяпер згарнулі, а то і практычна спынілі дзейнасць.

Сучасная кніга сваім знешнім выглядам адпавядае жаданню спажыўца атрымаць хуткую і поўную інфармацыю аб ёй і вырашыць, падыходзіць яна ці не. Загаловак, прозвішча і імя аўтара набіраюцца выразным, буйным шрыфтам. Загаловак у большасці выпадкаў кароткі, інфармацыйны. Ён суправаджаецца раскрываючымі яго сэнс ілюстрацыяй, фатаграфіяй, калажам. Амаль усе кнігі змяшчаюць даведачна-дапаможны апарат у выглядзе зместу, паказальнікаў, спасылак і адсылак, а таксама чарцяжоў, табліц, малюнкаў і інш. Магчыма, гэта вынік кароткай інфармацыйнай мовы сучасных сродкаў масавай інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нашы прагнозы ў дачыненні да лёсу кніжнай культуры Беларусі аптымістычныя: кніга захавае сваё значэнне ў грамадстве, культуры і адукацыі, хаця імклівы навукова-тэхнічны працэс не дазваляе ўпэўнена сказаць, у якой форме гэта будзе адбывацца. Хутчэй за ўсё далейшае развіццё атрымае электронная (віртуальная) кніга. Многія звязваюць свае надзеі з "новай архаікай" кнігі, а менавіта з рунічнай кнігай. Галоўнае тое, што ў любым выпадку яна захавае характэрную ёй прыроду. На зыходзе XX ст. мы назіраем толькі чарговае пераўвасабленне кнігі, як тысячагоддзі таму назад папірус і пергамент прыйшлі на змену гліняным таблічкам, а на змену рукапіснай кнізе з'явілася друкаваная. Кніга ўцягнута ў глабальныя працэсы інфарматызацыі і візуалізацыі грамадства і культуры. У галінах як традыцыйнай, так і нетрадыцыйнай кнігі сёння надаецца вялікая ўвага форме (напрыклад, у з'яве paperbacks), а таксама адпаведнасці запытам чытачоў. Можна сказаць, што паміж кнігай і чалавекам сёння "ідзе актыўны дыялог", у выніку якога кніга вучыць чалавека, а той фарміруе патрэбную яму кнігу.


1. *Григорьянц Е.И.* Книга в культуре.—СПб., 1993.
2. *Эскарпи Р.* Революция в мире книг.—М., 1972.



**Ю.В.Чарняўская,**
*ст. выкладчык*


## УЗАЕМАДЗЕЯННЕ КУЛЬТУР ЯК ШЛЯХ ДА АДЗІНАГА ЧАЛАВЕЦТВА

Вялікі філосаф XX ст. М.Бубер сцвярджаў, што светам культуры кіруюць адносіны "я— ты". Выдатны мысліцель М.Бахцін падкрэсліваў, што аснову і сутнасць культуры складае дыялог. Апошні абумоўлівае не толькі мову, але ж і саму магчымасць мыслення, паколькі кожная ідэя заўсёды ўзнікае ў адказ на іншую, існуе толькі "ва ўмовах жывога кантакту з чужой думкай, увасобленай у чужым голасе, у чужой, выяўленай у слове свядомасці. У пункце гэтага кантакту галасоў-свядомасцей і нараджаецца і жыве ідэя" (1, с. 147). Такі (не абавязкова выяўлены вонкава) дыялог М.Бахцін называе "мікрадыялогам". Мікрадыялог — умова камунікацыі чалавека з сабой і іншым



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ